# ЛІТАРАТУРНАЯ ДЫСКУСІЯ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ГАЗЕЦЕ: ДА ПЫТАННЯ ДЫЯЛЕКТЫКІ ТВОРЧАСЦІ

***Т. У. Падаляк***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tatsiana_pd@mail.ru*

Штодзённая грамадска-палітычная беларуская газета «Звязда» на працягу ўсёй сваёй гісторыі (выдаецца са жніўня 1917 г.) цесна супрацоўнічала з пісьменнікамі. На старонках выдання вяліся шматлікія дыскусіі па праблемах і перспектывах нацыянальнай літаратуры. Яны актуалізаваліся і актывізаваліся ў пачатку XXI ст. Газетная палеміка «Пісьменнік і грамадства» доўжылася каля года (май 2004 – сакавік 2005), мела шырокі грамадскі рэзананс і засведчыла, што СМІ адыгрываюць важную ролю ў папулярызацыі літаратуры, развіцці творчага дыяпазону, удасканаленні майстэрства пісьменніка. Прапаганда і падтрымка нацыянальнай літаратуры – найважнейшая дзяржаўная задача.

***Ключавыя словы:*** сродкі масавай інфармацыі; газета «Звязда»; дыскусія; нацыянальная літаратура; творчасць; пісьменнік.

# ЛИТЕРАТУРНАЯ ДИСКУССИЯ В ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ ГАЗЕТЕ: К ВОПРОСУ О ДИАЛЕКТИКЕ ТВОРЧЕСТВА

***Т. В. Подоляк***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, Минск, Республика Беларусь,*
*tatsiana_pd@mail.ru*

Ежедневная общественно-политическая белорусская газета «Звязда» на протяжении всей своей истории (издается с августа 1917 г.) тесно сотрудничала с писателями. На страницах издания проходили многочисленные дискуссии о проблемах и перспективах национальной литературы, которые актуализировались и обострились в начале XXI в. Газетная полемика «Писатель и общество» продолжалась около года (май 2004 –

март 2005), имела широкий общественный резонанс и свидетельствовала о важной роли СМИ в популяризации литературы, развитии творческого диапазона и совершенствовании мастерства писателя. Пропаганда и поддержка национальной литературы – важнейшая государственная задача.

***Ключевые слова:*** средства массовой информации; газета «Звязда»; дискуссия; национальная литература; творчество; писатель.

## LITERARY DISCUSSION IN A PUBLIC-POLITICAL NEWSPAPER: ON THE QUESTION OF THE DIALECTIC OF CREATIVITY

***T. U. Padaliak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: T. U. Padaliak (tatsiana_pd@mail.ru)*

The daily socio-political newspaper of Belarus «Zvyazda» throughout its history (published since August 1917) has closely collaborated with writers. Numerous discussions on the problems and prospects of national literature were held on the pages of the publication. They were updated and intensified at the beginning of the 21st century. The newspaper polemic «The Writer and Society» lasted about a year (May 2004 – March 2005), had a wide public resonance and testified that the media play an important role in the popularization of literature, the development of the creative range, and the improvement of the writer’s skill. Propaganda and support of national literature is the most important state task.

***Key words:*** mass media; newspaper «Zvyazda»; discussion; national literature; creativity; writer.

Грамадска-палітычная газета «Звязда», якая выдаецца з 9 жніўня 1917 г., на працягу сваёй гісторыі цесна супрацоўнічала з літаратарамі – як з вядомымі, сталымі творцамі, так і з пачаткоўцамі. Рэгулярна публікаваліся новыя вершы, байкі, апавяданні, аповесці (з працягам, у некалькіх нумарах). Традыцыйным стаў конкурс апавяданняў «Звязды», у якім удзельнічалі не толькі «самадзейныя» пісьменнікі-аматары, але і прафесіяналы. Многія класікі нацыянальнай літаратуры ўказваюць, што першая публікацыя з’явілася ў «Звяздзе», газета дала своеасаблівую пуцёўку ў творчае жыццё. Нямала беларускіх

пісьменнікаў свой працоўны шлях пачыналі ў рэдакцыі найстарэйшага перыядычнага выдання краіны.

На старонках газеты вяліся дыскусіі па розных пытаннях беларускай літаратуры. Яны актуалізаваліся, актывізаваліся і абвастрыліся ў пачатку XXI ст. Так, на працягу амаль года (май 2004 г. – сакавік 2005 г.) вялася дыскусія «Пісьменнік і грамадства», у ходзе якой шырока абмяркоўваліся праблемы і перспектывы развіцця нацыянальнай літаратуры. Штуршком да дыскусіі стала публікацыя размовы за «круглым сталом» пад загалоўкам «Без літаратуры няма народа, няма дзяржавы», змешчаная ў чатырох нумарах «Звязды»: 22, 25, 26, 27 мая 2004 г. (толькі надзвычай важныя матэрыялы штодзённая газета друкуе ў такім вялікім аб’ёме). У дыскусіі бралі ўдзел вядомыя беларускія літаратары: Раіса Баравікова, на той час галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», Мікола Мятліцкі, на той час галоўны рэдактар часопіса «Полымя» і Уладзімір Карызна, сааўтар Дзяржаўнага гімна Беларусі.

Закранаўся шырокі пласт надзённых пытанняў. Ва ўсе часы літаратура была духоўна-маральным камертонам грамадства, а ў «рынкавую» эпоху ўзнікаюць спрэчкі адносна яе запатрабаванасці. Пісьменнік і грамадства, літаратура і жыццё: як акрэсліць сучасныя стасункі? Ці застаюцца яны па-ранейшаму актуальнымі? Ці не згубіла літаратура свайго чытача і ці не губляецца сама літаратура? Ці правамерна гаварыць пра сацыяльны заказ у дачыненні да творчасці? Як процістаяць «непісьменным» творам, што выходзяць у прыватных выдавецтвах? Узнімаліся таксама тэмы творчай самаізаляцыі, якасці пісьменніцкага слова («тэкст» не з’яўляецца мастацкім творам), многія іншыя. Непрадузяты аналіз стану сучаснай беларускай літаратуры, шчырая зацікаўленасць нараджалі досыць гарачыя дыскусіі і нават спрэчкі. Загаловак публікацыі «Без літаратуры няма народа, няма дзяржавы» быў выбраны невыпадкова: літаратура – гэта не толькі творы, але і песня, якая ідзе ў жыццё з паэзіі; і тэатр, які вырас на літаратуры; і музыка, і выяўленчае мастацтва. Дыскусія ў «Звяздзе» распачыналася знакавымі словамі: нам, пісьменнікам, належыць культуралагічнае поле Айчыны. М. Мятліцкі слушна заўважыў: «Калі літаратура ляжыць толькі мёртвай, запыленай кнігай, тады “садзіцца” нацыянальна-духоўная планка ўвогуле. Тады пачынае хварэць тэатр сваімі праблемамі, пошукам нейкай камерцыі, агаляючы пэўныя часткі цела. Тады замест сапраўднай песні прыходзіць нізкапробная “папса”. Не трэба запіхваць літаратуру ў архаіку – гэта той сусвет, які трымае ўсё» (26.05.2004). У

пачатку 1990-х гг. паняцце сацыяльнага заказу ў дачыненні да літаратуры (і не толькі) было жорстка і груба раскрытыкаванае. Некаторыя сэнсава разумелі, успрымалі і трактавалі яго як загадна-лозунгавае, блытаючы «сацыяльны заказ» і «партыйны загад». Літаратура – заўсёдны водгук на праблемы і запатрабаванні грамадства, эпохі: і пранікнёныя Скарынавы прадмовы, і творы Багушэвіча, Багдановіча, Цёткі, Купалы, Коласа... Уся гісторыя сусветнай літаратуры пацвярджае гэта. Як сведчыць час, і «эпоха застою» не была для многіх творцаў духоўным астрогам: супраціўляючыся цэнзуры, яны выражалі сябе, стваралі насуперак забаронам – і гэта было, па сутнасці, іх сацыяльным заказам. А як можна вызначыць сацыяльны заказ у XXI ст.? Ці не знікае ён у сітуацыі, калі ўсё дазволена-разняволена? Р. Баравікова адзначыла: «Паняцце сацыяльнага заказу існуе ва ўсім свеце, заўсёды. Ёсць яшчэ і дзяржаўны заказ – гэта дзяржаўная абарона прафесіяналізму. Творчая планка, якая не павінна рушыцца» (25.05.2004).

Размова за «круглым сталом» стала падставай для шырокага абмеркавання праблем развіцця літаратуры. Газета запрасіла выказацца па закранутых пытаннях пісьменнікаў, паэтаў, літаратурных крытыкаў, настаўнікаў, студэнтаў, супрацоўнікаў радыё і тэлебачання – усіх, каму не абыякавы лёс нацыянальнай літаратуры і культуры. Пры гэтым рэдакцыя ўдакладніла: «Каб размова атрымалася дынамічнай і змястава насычанай, дамаўляемся аб фармаце выступленняў: 2–3 старонкі. Калі ласка, рабіце паметку: “Пісьменнік і грамадства”» (27.05.2004). Дыскусія ўзварухнула грамадскасць, яна мела шырокі розгалас. Меркаванні чытачоў змешчаны на старонках «Звязды» 5, 12, 16, 19, 22, 23, 24 чэрвеня, 9 ліпеня, 5 жніўня, 4 і 7 снежня. Не будзе перабольшаннем сцвярджаць, што з’явіўся пэўны «зрэз» грамадскай думкі па азначанай праблематыцы.

Своеасаблівыя вынікі газетнай палемікі падводзіліся 11 і 18 сакавіка 2005 г. у публікацыі «Ствараць нельга разбэшчваць (коска ставіцца згодна з памкненнямі)». Адзначалася, што пісьменнікі працуюць у супярэчлівым для літаратурнай творчасці часе, калі актыўна развіваюцца электронныя сродкі масавай інфармацыі. У такіх умовах і сама літаратура павінна быць больш яскравай, дынамічнай, напружанай, больш выверанай жанрава, больш мабільнай. Гэтая праблема існуе, літаратура павінна адпавядаць рэаліям свайго часу. Запатрабаванасць пісьменніка ў грамадстве будзе ўзрастаць перш за ўсё ад удасканалення яго таленту, ад яго рупнасці, зацікаўленасці жыццём

і «адраснасці» твораў. Пісьменнікам неабходна пераадолець застой у саміх сабе, таму што часам ідуць перапевы аднаго і таго ж. Удзельнікі дыскусіі абазначылі праблемы літаратурных часопісаў: утварылася своеасаблівае замкнёнае кола «часопіс – пісьменнік – часопіс». Творцы апынуліся ў пэўнай ізаляцыі: нібыта літаратурнае выданне цікавіць толькі саміх пісьменнікаў.

Дыскусія засведчыла аслабленыя пазіцыі літаратурнай крытыкі: яна не дамінуе ў літаратурным працэсе, не вядзе яго. Крытыка ў пэўнай ступені разгубілася, і калі гучаць нейкія галасы – то на ўзроўні водгукаў (у асноўным сяброўскіх) на тую ці іншую кнігу. Неабходна, каб літаратурна-крытычны працэс ажывіўся – на старонках усіх выданняў. Пры гэтым М. Мятліцкі абазначыў і «другі бок» праблемы: «Ці не кожная раённая друкарня выдае «мастацкую літаратуру», пачынаючых аўтараў. У рэспубліцы ўтварыўся цэлы паток нізкапробных кніг – не тое што не адрэдагаваных, нават карэктарамі не вычытаных. Прынцып “абы выдаць кніжку” дэвальвуе само разуменне літаратуры. Гартаючы такія кнігі, нашай крытыцы часам, можа, і не хочацца гаварыць пра іх услых? З гэтымі кнігамі аўтары прэтэндуюць на ўступленне ў Саюз пісьменнікаў – і іх прымаюць!» (18.03.2005).

Праблема, актуальная не толькі для літаратуры, але і для журналістыкі: на мяжы XX–XXI стст. укаранілася тэндэнцыя замест слова «твор» ужываць слова «тэкст»: «Я прынясу ў часопіс, газету (дашлю па электроннай пошце) тэкст». Па трапнай заўвазе М. Мятліцкага, «гэта ў калідорах рэдакцый гучыць з дня ў дзень. І навязваецца аўтарамі. Але тэкст – гэта штосьці напісанае ў парыве, а твор – вынашанае, напісанае не камп’ютарным ляскаsuccessfulннем, а душой. Знікае праца над творам, нярэдка ён абмяжоўваецца “тэкстам”» (18.03.2005). Гэта з’ява небяспечная для творчасці. Размова ідзе пра стваральную ролю літаратуры.

Падсумоўваючы газетную палеміку, літаратары падкрэслілі, што СМІ адыгрываюць важную ролю ў папулярызацыі літаратуры, развіцці творчага дыяпазону, удасканаленні майстэрства пісьменніка. Пры гэтым «Звязда» з’яўляецца класічным узорам газеты, якая дбае пра духоўнасць нацыі, прыцягвае ўвагу чытача да мастацкага слова. Вялікая дыскусія «Пісьменнік і грамадства» не губляе актуальнасці, паколькі прапаганда і падтрымка нацыянальнай літаратуры – найважнейшая дзяржаўная задача.